# З УЛАСЦІВАЙ КОМСАМОЛУ БОЛЬШЭВІЦКАЙ НАСТОЙЛІВАСЦЮ ПРЫВЕСЦІ У БАЯВУЮ ГАТОЎНАСЦЬ МТМ

## ВЫСТУПЛЕННЕ т. ШАРАНГОВІЧА

На нарадзе з прамовай выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч. Сваю прамову ён пачаў з аналіза прычын нездавальняючага выкарыстання трактароў па БССР.

— Час пакончыць з самацужніцтвам у сэнсе асваення сельска-гаспадарчых машын. Многія не разумеюць, што трактар ёсць такі механізм, які патрабуе ўвагі і самага беражлівага выкарыстання— кажа тав. Шаранговіч.

Вялікую ўвагу ў сваім выступленні звярнуў прамоўца на пытанні вывучэння трактара і здачы тэхнічнага экзамена.

Затым тав. Шаранговіч застанаўліваецца на тым, як МТМ сустрэлі рамонтную кампанію. Прыводзіць агідныя факты з гомельскай, лепельскай, аршанскай МТМ, дзе так званыя „дробязі" перашкаджаюць з поспехам правесці рамонт.

— Цэнтральнай задачай комсамола ў бліжэйшыя—першую і другую пяцідзёнку—гэта з уласцівым комсамолу гарачым тэмпераментам, большэвіцкай настойлівасцю прывесці ў баявую гатоўнасць МТМ.

Асаблівую ўвагу звяртае тав. Шаранговіч на правільнасць арганізацыі працы ў самай МТМ. Энтузіязм рабочых па рамонту часта сустракае сцяну коснасці ў сэнсе перабудовы ўсёй сістэмы работы.

— Мы маем усе магчымасці, каб праз некалькі дзён усе варштаты МТМ закруціліся— кажа прамоўца. Там, дзе няма рухавіка трэба паставіць трактар.

Тав. Шаранговіч затым спыняецца на ролі заводаў і заводскага комсамола ў дапамозе машынатрактарным майстэрням і МТС. Асабліва падкрэслівае каштоўнасць ініцыятывы помпалітаў горацкай і заслаўскай МТС аб арганізацыі спаборніцтва заводаў з МТС. Гэта справа—зазначае ён— справа не толькі металазаводаў, але і ўсіх прадпрыемстваў. Фабрыка „Дзвіна", якая перапрацоўвае лён, можа ўзяць шэфства над буйнай ільнаводчай МТС. Трэба стварыць грамадскую думку вакол шэфства і дапамогі МТС.

Трэцім пытаннем тав. Шаранговіч высоўвае захаванне машын. Да захавання на зіму машын павінна быць прыкавана такая-ж увага, як у мінулым годзе да захавання каня.

Прамоўца заастрае ўвагу ўдзельнікаў нарады на неабходнасць рашучага пералома ў сэнсе падрыхтоўкі патрэб-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам
дакумента можна азнаёміцца
ў будынку бібліятэкі